# КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БССР У 1944–1953 ГГ. ПА АРХІЎНЫХ МАТЭРЫЯЛАХ МАЛАДЗЕЧАНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**А. А. Мядзведзева**

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, г. Мінск;*
*sasha100965@gmail.com;*
*навук. кір. – А. Г. Кахановскі, д-р гіст. навук, праф.*

Артыкул прысвечаны калгаснаму будаўніцтву ў заходніх абласцях Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы ў 1944–1953 гг. Мэта – разгледзіць калектывізацыю ў заходніх раёнах Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў 1944–1953 гг. На прыкладзе Маладзечанскай вобласці разгледжаны працэс аднаўлення сельскай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд у заходніх абласцях Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, вызначаны этапы калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Трэба адзначыць, што ў выніку калектывізацыі адбыліся структурныя змены ў сельскай гаспадарцы заходніх абласцей Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якія адбіліся на жыцці сялянства ў цэлым. У гістарыяграфіі пытанне калектывізацыі ў большасці выпадкаў не з'яўляецца прадметам спецыяльнага разгляду – гэты працэс разглядаецца ў больш шырокім кантэксце.

***Ключавыя словы:*** калектывізацыя заходніх абласцей БССР; этапы калектывізацыі; кааперацыя; масавая калектывізацыя; калектывізацыя Маладзечанскай вобласці.

У 1944-1953 гг. адбыліся структурныя змены ў сельскай гаспадарцы Заходняй Беларусі – у гэты час была праведзена калектывізацыя і абсалютная большасць сялянскіх гаспадарак была аб’яднана ў складзе калгасаў і саўгасаў. Усё гэта вельмі змяніла жыццё сялянства, т.я. да гэтага часу жыхары заходніх абласцей БССР вялі аднаасобную гаспадарку, а ў выніку калектывізацыі яны былі аб’яднаны ў складзе калектыўных гаспадарак. У пасляваенны перыяд калектывізацыю заходніх абласцей БССР можна падзяліць на два этапы.

Першы этап калектывізацыі (1944–1948 гг.) быў накіраваны на стварэнне перадумоў для правядзення масавай калектывізацыі. У гэты перыяд адбывалася аднаўленне гаспадаркі пасля вайны, тэхнічная і маральна-псіхалагічная падрыхтоўка заходнебеларускага грамадства да зменаў.

Быў узяты курс на кааперацыю – з 1945 года заахвочвалася сялянская ініцыятыва па стварэнні рознага роду першасных формаў кааперацыі. У жніўні 1947 года бюро Маладзечанскага абкама КП(б)Б прыняла пастанову аб стварэнні сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі і груп сумеснай апрацоўкі зямлі. Адзначалася, што раней, у перыяд веснавой сяўбы ў Маладзечанскай вобласці былі створаны 13 груп па сумеснай

апрацоўцы зямлі, у якой было аб'яднана 147 сялянскіх гаспадарак. Яны сумесна апрацавалі 142 гектара зямлі [1, с. 55–57].

На першым этапе калектывізацыі прадугледжвалася добраахвотнае ўступленне насельніцтва ў калгасы. У 1947 годзе на чэрвеньскім пленуме ЦК КП(б)Б партыйным арганізацыям у адносінах да калектывізацыі ставілася задача не задавацца шырокімі планамі, строга выконваць палітыку партыі ў галіне палітыкі калектывізацыі і не дапускаць паспешлівасці ў справе стварэння калгасаў [1, с. 58].

Патрэбна адзначыць, што ў гэты перыяд калектыўныя гаспадаркі адчувалі востры недахоп інвентару, насення, угнаенняў, што тармазіла аднаўленне аграрнага сектара. Нездавальняючы характар насіла арганізацыя працы, бо ў многіх калгасах адсутнічалі нормы выпрацоўкі, не складаліся вытворчыя і працоўныя планы, не былі заведзены працоўныя кніжкі, былі праблемы з налічэннем трудадзён. Напрыклад, калгасніку Скарынкевічу В. С. за 68.40 адпрацаваных дзён у 1946 годзе не выплацілі належныя грошы і хлеб [2, с. 37], а ў калгасе імя І. В. Сталіна Узбалоцкага сельсавету за 1946 год вялікі працэнт працадней пайшоў на адміністрацыйна-кіраўнічы апарат, а трое калгаснікаў не выпрацавалі мінімуму працадней [3, с.7].

Патрэбна адзначыць, што вялікая колькасць калгасаў заходніх абласцей БССР паспяхова спраўлялася з усімі сельскагаспадарчымі работамі. Паступова ішло пашырэнне пасяўных плошчаў, развівалася жывёлагадоўля. Калгаснікі своечасова, а даволі часта і датэрмінова выконвалі дзяржаўныя абвязацельствы па пастаўках сельскагаспадарчай прадукцыі. Напрыклад, у сельгасарцелі «Чырвоная зорка» Вілейскага раёна ў 1948 годзе сабралі з аднаго гектара па 18 цэнтнераў жыта і па 15 цэнтнераў пшаніцы [4, с. 144]. Увогуле Маладзечанская вобласць у кастрычніку 1948 года здала хлеба зверхплану на 195 тысяч пудоў [5]. А калгас імя Я. Купалы Радашковічскага раёна выканаў план сева ранішніх збожжавых культур на 101,3 %, ільна на 100 % [6].

Аднак, працэс аднаўлення і стварэння калгасаў праходзіў вельмі павольна, таму ў кастрычніку 1948 года на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі было 715 калгасаў (4,9 % калектывізацыі). У Маладзечанскай вобласці быў створаны 61 калгас [7].

Другі этап калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР адбываўся ў 1949–1952 гг. На пачатак 1949 года ўжо былі створаны перадумовы для больш маштабнага і хуткага працэсу калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР. Таму пасля XIX з'езда КП(б)Б было прынята рашэнне праводзіць масавую калектывізацыю.

У гэты перыяд узмацнілася агітацыя сялян па стварэнні калгасаў. У 1949 годзе сталі распаўсюджвацца экскурсіі сялян-аднаасобнікаў

заходніх абласцей БССР у перадавыя гаспадаркі ўсходніх раёнаў БССР. Напрыклад, у 1949 годзе земляробы Маладзечанскай вобласці пабывалі ў калгасах «1 Мая» і «Чырвоны Маяк» Слуцага раёна [1, с. 60].

У сакавіку 1949 года прайшоў І з'езд калгаснікаў Маладзечанскай вобласці, на якім прысутнічалі прадстаўнікі 370 калгасаў, якія аб'ядноўвалі 13840 сялянскіх гаспадарак і 55 тысяч чалавек. З'езд прайшоў пад эгідай масавага руху працоўных за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі вобласці [8].

Тэмпы росту калектыўных гаспадарак у 1949–1952 гадах былі вельмі высокімі. Уступалі цэлымі вёскамі, у архівах захоўваюцца дадзеныя сялянскіх сходаў, на якіх прымалі рашэнні аб стварэнні калгасаў. Аднак, даволі часта калгас стваралі і ён заставаўся на паперы, бо не было кааперацыі і абагульнення жывёлы, прылад працы, зямель [1, с. 82].

На другім этапе калектывізацыі адбывалася ўкрупненне калгасаў. У пастанове ЦК ВКП(б) ад 30 мая 1949 года «Аб узбуйненні дробных калгасаў і задачах партыйных арганізацый у гэтай справе» было прапісана, што «дробныя калгасы не могуць эфектыўна ўкараняць новую тэхніку і тэхналогію». У выніку, больш за 2200 дробных калгасаў былі аб'яднаны ў 599 узбуйненых калгасаў [9, с. 117].

На IV пленуме ў маі–ліпені 1950 года ЦК КП(б)Б канстатавалася, што масавая калектывізацыя ў заходніх абласцях БССР пачата з вялікім спазненнем (толькі ў 1949 годзе), у практычнай рэалізацыі дапускалася шмат памылак і калектывізацыя моцна зацягнулася [11]. З дадзеным сцвярджэннем быў не згодзен першы сакратар Маладзечанскага абкама КП(б)Б І. Ф. Клімаў, які аспрэчыў наяўнасць вялікай колькасці памылак у партыйнай працы. Ён таксама ўдакладніў, што масавая калектывізацыя ў заходніх абласцях БССР пачалася ў большасці абласцей летам і восенню 1948 года, калі цэлыя вёскі беднякоў і серадняков масава запісваліся ў калгасы. Таксама было адзначана, ЦК КП(б)Б з вялікім спазненнем усвядоміў гэты працэс [12].

У лютым 1951 года была пастаўлена задача завяршыць калектывізацыю, палітычна і арганізацыйна-гаспадарча ўмацаваць калгасы. Была зроблена ўстаноўка – скончыць калектывізацыю за 2–3 месяцы, каб вясновую сяўбу правесці калектыўна. На 1 кастрычніка 1951 года створана 4567 калектыўных гаспадарак, працэнт калектывізацыі – 89,4 %. На пачатку 1952 года ў заходніх абласцях БССР было аб’яднана ў калгасы 90,4 % сялянскіх гаспадарак.

У верасні 1952 года на XX з’ездзе КП(б)Б падвялі вынікі калектывізацыі. Было канстатавана, што калектывізацыя ў заходніх абласцях БССР завершана. [1, с. 126].

У выніку патрэбна сказаць, што правядзенне калектывізацыі ў заходніх абласцях БССР прывяло да змянення сацыяльна-эканамічнай структура вёскі. Адбыўся пераход ад шматукладнай эканомікі на дадзенай тэрыторыі да аднаукладнай. Адзінаасобная сістэма гаспадарання змянілася на кааператыўную ў выглядзе сельгасарцеляў і калгасаў. Змянілася сацыяльная структура вёскі: заможны клас сялян знік, а на іх месцы прыйшлі бедныкі і серадныкі. Больш заможная частка сялянства была раскулачана. Была парушана ранейшая форма жыцця ў заходніх абласцях БССР і адразу ж створана новая. Калектывізацыя прывяла да зменаў у жыцці грамадства, да страты былых каштоўнасцей і да фарміравання светапогляду савецкага чалавека.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Смяховіч, М. У.* Сельская гаспадарка Беларусі ў 1943-1991 гг: этапы развіцця, дасягенні, вопыт/ М. У. Смяховіч –НАН, Інст-т гісторыі. –Мінск: Беларуская навука, 2017. – 439 с.
2. Заявление колхозника В. С. Скорынкевича правлению колхоза имени И. В. Сталина Хожевского сельсовета Молодечненского района об оплате труда, 04.03.1947// Аграрные преобразования в Молодечненской области, 1944–1953 гг.: документы / НАРБ, ЗГА г. Молодечно, Археографическая комиссия Комитета по архивам и делопроизводству при Совете Министров Республики Беларусь. – Минск: НАРБ, 2003. – 435 с.
3. Замечания и предложения заведующего Воложинским райзо Г. Л. Бараникова по отчету колхоза имени И. В. Сталина Узболотского сельсовета об основной деятельности за 1946 г., 05.03.1947// Аграрные преобразования в Молодечненской области, 1944—1953 гг.: документы / НАРБ, ЗГА в г. Молодечно, , Археографическая комиссия Комитета по архивам и делопроизводству при Совете Министров Республики Беларусь. – Минск: НАРБ, 2003. – 435 с.
4. *Полуян, И. В.* «Социально-экономические и культурные преобразования / И. В. Полуян // Назаўсёды разам: Да 60-годдзя ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР. – Мінск: БелЭН, 1999. – С. 109–115.
5. *Барадач, Г. А., Дамарад К. І.* Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях БССР/ Г. А. Барадач – Мінск: Дзярж. Выд-ва БССР, 1959. – 166 с.
6. Справки молодечненского обкома о проведении отчетно-выборных собраний в колхозах области, об итогах социалистического соревнования и о плане посева льна// НАРБ. – Ф. 4п. – О. 46. – Д. 351. – Л. 5.
7. Постановление Молодечненского обкома КП(б)Б от 03.07.1948 о полусении знамени Совета Министров БССР и ЦК КП(б)Б// Зональный государственный архив в г. Молодечно. – Ф. 237. – Оп. 4. – Д.25. – Л. 106, 107, 192.
8. Стенограмма совещания по вопросу колхозного строительства в западных областях Белоруссии от 21.10. 1948// НАРБ. – Ф. 4п. – О. 29. – Д. 623. – Л. 48–77.
9. Из доклада первого секретаря Молодечненского обкома КП(б)Б И.Ф. Климова на I съезде колхозников области, 18.03.1949 Аграрные преобразования в Молодечненской области, 1944–1953 гг.: документы / НАРБ, ЗГА г. Молодечно, Археографическая комиссия Комитета по архивам и делопроизводству при Совете Министров Республики Беларусь. – Минск: НАРБ, 2003. – 435 с.

10. О помощи западным областям в наведении порядка в землепользовании новых колхозов, 4.07.1949// НАРБ. – Ф. 4п. – О.46 – Д. 390 – Л. 247.
11. Из доклада первого секретаря ЦК КП(б)Б Н. И. Гусарова на VI пленуме ЦК КП(б)Б о решении ЦК ВКП(б) о недостатках в руководстве ЦК КП(б)Б сельским хозяйством, 31.05.1950// НАРБ – Ф. 4п.– Оп. 20. – Д. 269. – Л.26–30.
12. Из выступления первого секретаря Молодечненского обкома КП(б)Б на на VI пленуме ЦК КП(б)Б, 01.06.1950// НАРБ– Ф. 4п. – Оп. 20. – Д. 269. – Л. 127–129.